ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры
Гродзенскага аблвыканкама
А.В. Клімовіч
03 снежня 2023 г.

**ІНСТРУКЦЫЯ аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу танцавальных калектываў “СКОКІ ВА ЎСЕ БОКІ”**

1. Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу танцавальных калектываў “Скокі ва ўсе бокі” (далей – Конкурс).

2. Мэтамі і задачамі Конкурсу з’яўляюцца: вывучэнне, аднаўленне і захаванне мясцовай (рэгіянальнай) традыцыйнай танцавальнай культуры і стварэнне відэаархіва лепшых узораў танцавальнага мастацтва Гродзенскай вобласці; развіццё і прапаганда беларускага харэаграфічнага мастацтва, стымуляванне і актывізацыя дзейнасці танцавальных калектываў розных напрамкаў, узаемаўзбагачэнне рэпертуару лепшымі ўзорамі беларускай танцавальнай спадчыны, сучаснай харэаграфіі, арганізацыя вольнага часу і развіццё творчых здольнасцей дзяцей і моладзі, выяўленне калектываў з мэтай рэкамендацыі для надання наймення “народны” (“узорны”).

3. Арганізатары Конкурсу: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, аддзел культуры Смаргонскага райвыканкама.

4. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем Конкурсу ствараецца арганізацыйны камітэт (далей – аргкамітэт), які фарміруецца з прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і зацікаўленых арганізацый (Дадатак 1).

5. Аргкамітэт:

- уносіць на разгляд упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама прапановы па каштарысе выдаткаў на арганізацыю і правядзенне Конкурсу, умовах правядзення Конкурсу і відах заахвочвання ўдзельнікаў;
- узгадняе склад рэжысёрска-пастановачнай групы, склад журы Конкурсу, спіс удзельнікаў Конкурсу, праграму правядзення Конкурсу, узоры ўзнагарод, іншую атрыбутыку, план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні Конкурсу;
- вызначае віды і формы інфармацыйна-рэкламнай падтрымкі Конкурсу;

- вырашае іншыя пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем Конкурсу.

6. Конкурс праводзіцца 1 раз у 2 гады.

7. У 2023 годзе Конкурс праводзіцца 4 лістапада ў ДУК "Смаргонскі раённы цэнтр культуры".

8. У выпадку пераносу тэрмінаў правядзення Конкурсу ці яго адмены па аб'ектыўных прычынах калектывы, якія даслалі заяўкі, будуць паведамлены індывідуальна.

9. У Конкурсе прымаюць удзел лепшыя дзіцячыя і дарослыя харэаграфічныя аматарскія калектывы (незалежна ад іх ведамаснай прыналежнасці) - пераможцы раённых (гарадскіх) фестываляў, конкурсаў, аглядаў.

10. Калектывы са званнем "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь" удзельнічаюць па-за конкурснай праграмы.

11. Агульная колькасць калектываў, заяўленых на Конкурс, не павінна перавышаць 3-х (для раёна) і 6-ці (для г. Гродна і г. Ліда).

12. Кожны калектыў рыхтуе 1 харэаграфічны нумар у адной з дзвюх намінацый, якія раней не быў прадстаўлены на дадзеным Конкурсе.

13. Журы Конкурсу (Дадатак 2) ацэньвае асобна калектывы з найменнем "народны", "узорны" і калектывы, якія не маюць наймення, у дзвюх узроставых катэгорыях: дзіцячая (да 14 гадоў), дарослая (ад 15 гадоў і болей) па наступных намінацыях:

- народны танец (беларускі, рускі, украінскі і інш.);
- сучасны, эстрадны танец (усе віды).

14. Па выніках Конкурсу пераможцам прысвойваюцца званні "лаўрэатаў" (I, II, III ступеняў) і ўручаюцца дыпломы і прызы, асобным лепшым калектывам уручаюцца спецыяльныя дыпломы і прызы, астатнія калектывы атрымліваюць дыпломы за ўдзел у Конкурсе.

15. Журы ўзнагароджвае калектывы спецыяльнымі прызамі і дыпломамі:

- за арыгінальны сцэнічны касцюм;
- за лепшае рэжысёрскае вырашэнне нумара;
- за пераемнасць народных традыцый і ўвасабленне нацыянальнага каларыту;
- за лепшую інструментальную ці аркестравую групу суправаджэння;
- за лепшы балетмайстарскі нумар;
- за паспяховы дэбют.

16. Пры адсутнасці ўдзельнікаў у намінацыі альбо ўзроставай катэгорыі журы мае права аб'ядноўваць намінацыі, не прысвойваць

месцы, вызначаць дадатковыя спецыяльныя дыпломы і прызы ў межах выдзеленага прызавога фонду Конкурсу.

17. Пры падвядзенні вынікаў Конкурсу журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі адзнакі: узровень балетмайстарскай пастаноўкі, выканальніцкае майстэрства, якасць музычнага суправаджэння, арыгінальнасць і самабытнасць, сцэнічная культура.

18. Рашэнне журы з'яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

19. Для ўдзелу ў Конкурсе неабходна даслаць заяўку (Дадатак 3) **да 1 кастрычніка 2023 года** па адрасе: 230025, г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК "Гродзенскі АМЦНТ". Тэл. +375 152 623803, +375 29 5873956, тэл/факс: +375 152 623787, e-mail: info@gromc.by.

20. Фінансаванне Конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" на цэнтралізаваныя мерапрыемствы. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: набыццё прызоў і спецыяльных прызоў, дыпломаў і рамак.

21. Для фінансавання Конкурсу могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

22. Усе выдаткі па знаходжанні на Конкурсе калектываў ажыццяўляюцца за кошт накіроўваючых арганізацый.

23. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення, а таксама перанос даты правядзення Конкурсу (у іншыя тэрміны).

24. Арганізатары Конкурсу захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак 1
да інструкцыі аб арганізацыі і правядзенні абласнога конкурсу танцавальных калектываў "СКОКІ ВА ЎСЕ БОКІ"

# СКЛАД АРГКАМІТЭТА
абласнога конкурсу танцавальных калектываў "Скокі ва ўсе бокі"

| | |
|---|---|
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта; |
| Ражава Т.М. | начальнік аддзела культуры Смаргонскага райвыканкама, намеснік старшыні аргкамітэта; |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | галоўны спецыяліст управлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Крацянок Г.І. | дырэктар ДУК "Смаргонскі раённы цэнтр культуры"; |
| Пекар А.Ю. | загадчык аддзела аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Мерчы Т.І. | вядучы метадыст ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" |

Дадатак 2
да інструкцыі аб арганізацыі і правядзенні абласнога конкурсу танцавальных калектываў "СКОКІ ВА ЎСЕ БОКІ"

## СКЛАД ЖУРЫ
абласнога конкурсу танцавальных калектываў "Скокі ва ўсе бокі"

| | |
|---|---|
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, старшыня журы; |
| Ражава Т.М. | начальнік аддзела культуры Смаргонскага райвыканкама, намеснік старшыні журы; |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці"; |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Басякова Ю.А. | выкладчык УА "Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў"; |
| Урукіна Н.І. | Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, балетмайстар Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь узорнага харэаграфічнага ансамбля "Лялечкі" Абухаўскага цэнтра культуры філіяла ДУК "Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр" |

Дадатак 3
да інструкцыі аб арганізацыі і правядзенні абласнога конкурсу танцавальных калектываў “СКОКІ ВА ЎСЕ БОКІ”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела культуры
гар(рай)выканкама

## ЗАЯЎКА
на ўдзел у абласным конкурсе танцавальных калектываў
“Скокі ва ўсе бокі”

1. Раён (горад)________________________________________________
2. Намінацыя__________________________________________________
3. Узроставая катэгорыя (дзіцячая, дарослая)______________________
4. Поўная назва калектыву______________________________________
_____________________________________________________________
5. База дзейнасці калектыву____________________________________
_____________________________________________________________
6. Назва і працягласць нумару__________________________________
7. Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка калектыву________________
_____________________________________________________________
8. Тэлефоны: (службовы)_______________; (мабільны)______________
9. Колькасць удзельнікаў _______________________________________
10. Наяўнасць фанаграмы ці інструментальнай (аркестравай) групы_____
11. Тэхнічнае забеспячэнне (пры наяўнасці інструментальнай групы)
_____________________________________________________________
12. Творчая характарыстыка (не больш 50 слоў)
_____________________________________________________________
_____________________________________________________________
_____________________________________________________________

Кіраўнік базавай установы ___________________________

Заяўкі дасылаюцца да 1 кастрычніка 2023 г. на адрас: 230025, г.Гродна вул.Савецкая, 8, ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”; e-mail: info@gromc.by.
Кантактныя тэлефоны: +375152 623795, +375152 623799; тэл./факс: +375 152 623787